БІБЛІЯТЭКА САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ

БИБЛИОТЕКА СОЮЗА ПИСАТЕЛЕЙ БЕЛАРУСИ

Васіль НАЙДЗІН

# АНЮЦІНЫ ВОЧКІ

АПАВЯДАННІ

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2017

УДК 821.161.1(476)-1
ББК 84(4Беи)-5
Н 20

**Найдзін, В. І.**

Н 20 Анюціны вочкі: апавяданні / Васіль Найдзін. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2017. — 288 с. — (Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі).

ISBN 978-985-581-051-4.

У новай кнізе пісьменніка-гумарыста Васіля Найдзіна выразна гучыць шчырая і непаўторная, зусім не сумная сімфонія нашага жыцця — імклівага, напорыстага, часам супярэчлівага і складанага.

Героі яго твораў — незвычайна звычайныя людзі, якія часам нават не ўсведамляюць, наколькі камічным выглядае іх жыццё.

Вобразы і характары, псіхалогію герояў аўтар удала падсвечвае яркімі сатырычнымі фарбамі: жарты і ўсмешкі заўсёды дапамагаюць жыць, працаваць, кахаць…

Адрасавана шырокаму колу чытачоў.

**УДК 821.161.1(476)-1**
**ББК 84(4Беи)-5**

**ISBN 978-985-581-051-4**

© Найдзін В. І., 2017
© Кананові́ч І. І., прадмова, 2017
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва “Чатыры чвэрці”», 2017

# Далёкае – зблізку

З творчасцю пісьменніка Васіля Найдзіна я пазнаёміўся даўно, падчас работы карэспандэнтам у рэдакцыі газеты «Аўтазаводзец» яшчэ ў 60-я гады мінулага стагоддзя. Па тым часе на базе Мінскага аўтазавода было створана вытворчае аб'яднанне «БелаўтаМАЗ», у склад якога ўвайшоў і Магілёўскі аўтазавод разам з іншымі аўтаагрэгатнымі заводамі краіны. Па заданні рэдакцыі даволі часта даводзілася ездзіць на гэта прадпрыемства і асвятляць вытворчую дзейнасць і шматграннае жыццё калектыву. Жывучы ў гасцініцы, па прафесійнай звычцы заўсёды набываў кіпу свежых газет.

Па тым часе газеты чыталіся ад першага да апошняга радка, асабліва вечарам, калі пасля наведвання прадпрыемства вяртаўся ў пакой. У гасцініцах тэлевізары тады былі рэдкасцю, таму вечарамі паглыбляўся ў перыёдыку. Пачытаць было што. Ва ўсесаюзнай і рэспубліканскай прэсе друкавалася шмат цікавых праблемных матэрыялаў — артыкулаў, нарысаў, зарубежных карэспандэнцый. Асабліва прыцягвалі ўвагу фельетоны і літаратурныя творы.

Праглядаючы «Магілёўскую праўду», натрапіў на гумарэску. Аўтарам яе быў Васіль Найдзін. Невялікі твор уразіў і запаў у душу. А крыху пазней я пачаў сустракаць і, безумоўна, уважліва чытаць гумарэскі, сатырычныя творы, апавяданні за подпісам Васіль Найдзін альбо Васіль Чаромхін на старонках штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва», часопісаў «Вожык», «Работніца і сялянка», «Род-

ная прырода» і іншых выданняў. Шмат яго гумарэсак на спартыўную тэматыку друкавалася ў газеце «Физкультурник Белоруссии». Некаторыя яго творы чытаюць артысты эстрады, гучаць яны і па радыё ў перадачы «На вясёлай хвалі».

У бібліятэцы «Вожыка» выходзяць зборнікі яго апавяданняў і гумарэсак «Мужчынскія сакрэты», «Сустрэнемся ў Барселоне». Першая кніга выйшла ў свет у выдавецтве «Мастацкая літаратура» — «Аддаю вам». Творы таленавітага аўтара з непаўторным позіркам на жыццё рэгулярна змяшчаюцца ў калектыўных зборніках «Сакрэт фірмы (1979), «Кубік Рубіка» (1987), «Размова па шчырасці», «Ад гарэлкі розум мелкі» (абодва 1990).

Асабіста пазнаёміліся напрыканцы ХХ стагоддзя падчас выдання кнігі «Кветка кактуса».

У рэдакцыйны кабінет зайшоў статны высокі мужчына з добразычлівай усмешкай, назваўся:

— Маю намер прапанаваць вам рукапіс кнігі сатыры і гумару. Кажуць, чарга вялікая. Чэргі ў нас — з’ява звыклая…

— У нас, акурат, востры дэфіцыт кніг такога жанру, — шчыра адказаў я. — Пра дэфіцыт і чэргі вы шмат ужо напісалі і надрукавалі. Думаю, у хуткім часе пабачыць свет і ваша кніга. А ў кнігарнях яна доўга не заляжыцца…

Так яно і адбылося. «Кветка кактуса» выйшла па тым часе тыражом невялікім — 3 000 экзэмпляраў, але бяру на сябе смеласць сцвярджаць: героі сатырычных твораў аўтара і зараз жывыя…

Выпраўку я адразу заўважыў пры першым знаёмстве. Вайсковую службу — поўныя чатыры гады — Васіль Найдзін праходзіў на караблях і ў часцях Чарнаморскага і Балтыйскага флатоў. Дарэчы, першае яго гумарыстычнае апавяданне з’явілася на старонках штодзённай флоцкай газеты «На страже Балтики» ў 1965 годзе. А потым, як кажуць, пайшло

і паехала. Смяшыў працяглы час сваімі гумарэскамі строгіх камандзіраў і затурканых нялёгкай службай матросаў. Друкаваліся і кароткія апавяданні, навелы, эцюды. Амаль заўсёды пры справе з ім быў і фотаапарат.

Сябры-таварышы пад канец службы мелі на сваіх пагонах паболей жоўтых лычак, але ў старшага матроса Васіля Найдзіна былі граматы і падзякі ад адмірала і віцэ-адмірала. Камандуючы флотам узнагароджваў за актыўную ваенкараўскую працу, а другі — за дзейнасць у складзе літаратурнага аб'яднання Балтыйскага флоту.

У штат раённай газеты «Зара камунізму», пасля праходжання тэрміновай службы і вяртання ў родныя Бялынічы ў 1967 годзе, яго залічылі без ніякіх пытанняў. Шматлікія друкаваныя матэрыялы гаварылі самі за сябе. Пачынаў фотакарэспандэнтам, закончыў намеснікам рэдактара. Працаваў і вучыўся. У 1973 годзе завочна закончыў Магілёўскі педагагічны інстытут, а потым яшчэ і Вышэйшую партыйную школу (група рэдакцыйна-выдавецкіх работнікаў).

Шматгадовыя творчыя сувязі з часопісам «Вожык» атрымалі далейшае развіццё: рэдактар аддзела пісьмаў, потым — рэдактар аддзела фельетонаў. Нездарма гарачым цэхам называлі працу ва аўтарытэтным рэспубліканскім выданні сатыры і гумару, тыраж якога ў тыя гады даходзіў да 300 тысяч! Перыядычнасць — два нумары на месяц. Той, хто пісаў ці спрабуе пісаць фельетоны альбо крытычныя матэрыялы, ведае, што гэта такое... Тры гады працы ў «Вожыку» далі шмат — і жыццёвую загартоўку, і творчыя набыткі.

Не было перадыху ды спакою і тады, калі дзесяць гадоў працаваў намеснікам рэдактара газеты «Мінская праўда», сямнаццаць — узначальваў рэдакцыйную службу Сакратарыята нашага Парламента...

Пачуццё гумару неаднойчы дапамагала вырашаць няпростыя пытанні і справы, уздымала настрой калегам па працы, яднала калектыў. А без настрою — якая можа быць работа! Ды і сатыра павінна быць у здаровым грамадстве.

Скажу шчыра: у працэсе рэдагавання кнігі Васіля Іванавіча нельга было стрымаць смех. Каб не рагатаць на ўсю рэдакцыю, выходзіў на лесвічную пляцоўку і там даваў волю пачуццям і эмоцыям.

Аналіз твораў пісьменніка дае падставу сцвярджаць, што Васіль Найдзін у галіне сатыры працягвае лепшыя традыцыі рускай і беларускай класікі — Салтыкова-Шчадрына, Гогаля, Якуба Коласа, Цёткі, Кандрата Крапівы, Васіля Шукшына і іншых майстроў мастацкага слова.

Творца ўмее трапным словам раскрыць характар, псіхалогію і памкненні героя, выклікаць у чытача шчырую ўсмешку. Васіль Найдзін мае адметную здольнасць бачыць і паказваць камічнае ў самых ардынарных з'явах і ўчынках, раскрыць характар сваіх герояў у сатырычна-гумарыстычнай святле. Пры гэтым выклікае ўсмешкі ў чытача вобразным словам, нечаканым паваротам думкі і псіхалогіі вобраза.

Кожны твор пісьменніка — апавяданне, замалёўка ці навела — трывала змацаваны стылёва-моўнай «арматурай», да якой і камар носа не падточыць. Чытач творы аўтара ўспрымае як каштоўнае ўпрыгожанне, складзенае з зіхатлівых алмазаў.

**Іван КАНАНОВІЧ**,
пісьменнік

# МОРАНЫ ДУБ

1

Пачнём з дробязнай падзеі, якая мела месца гадоў пяцьдзясят, а можа, і сто таму. Дык вось, у тыя далёкія ад нас гады ў невялікай рэчцы Д. затануў дуб. Можа, іх наогул тады шмат лягло на дно пры розных абставінах і сітуацыях. Толькі ў дадзеным выпадку гэта быў сапраўдны дуб! Цяпер такія не растуць. Глеба не тая, паветра… Хімія ўсюды, дым, гар. Але не пра гэта размова. Вернемся да часоў даўніх, светлых.

Магло здарыцца, што ляснога волата павалілі пры дапамозе пілы, а тады ўжо дапетрылі: яго ж нікуды не завязеш, нават не пагрузіш. Хоць дваццаць чалавек збірай. Пуп толькі надарвеш… Пра лесавозы, магутныя краны ў той час ніхто не чуў і не бачыў. Па прычыне поўнай адсутнасці тэлебачання, інтэрнэту і ўсяго астатняга. Карацей кажучы, плюнулі на гэты дуб тыя, хто яго паваліў, і спіхнулі ў ваду.

Да самага апошняга часу, з моманту затаплення, ніякіх падзей вакол дуба і блізка не было. У свеце, безумоўна, шмат змен, здарэнняў і катаклізмаў адбылося, а тут — цішыня. Нават ніякага гніення. Паблізу дрэва толькі рыбкі розныя плавалі, багавінне яго абвіло, п'яўкі паналіпалі… Дробязі! Нават гаварыць пра іх не хочацца.

Але вось у вёсачку, якая прытулілася да знаёмай нам ракі, на пастаяннае месцажыхарства прыехалі муж і жонка Сініліны. Жылі яны раней у вялікім горадзе. А на схіле гадоў аблюбавалі ціхую мясціну, нагледзелі домік, купілі яго і развіталіся з дзецьмі: маўляў, жывіце самастойна, у згодзе і дастатку. І нас не забывайце, сумленных пенсіянераў. Прыязджайце ў любую пару года, заўсёды будзем рады…

Зразумела, дзеці супраць такога ходу падзей нічога не мелі. Наадварот, вельмі ўзрадаваліся: ім засталася шыкоўная кватэра. У дадатак — сёе-тое з мэблі і іншай хатняй маёмасці. Бацькі ёсць бацькі. Што ты пра іх будзеш гаварыць?! Мабыць, толькі тое, што пад старасць іх не цікавяць шырокія і шумныя праспекты, трамваі і аўтобусы, атракцыёны ў парках і розныя шоу. Не ў захапленні яны чамусьці ад супер- і гіпермаркетаў, дамоў-гмахаў. «Засланілі ўсё неба…» І калі там, дзесьці наверсе, палыхае ад суквецця выбухаў-салютаў, яны ўжо спяць. Карацей кажучы, ім патрэбны ў неабмежаванай колькасці спакой і цішыня, чыстае паветра. Сад-агарод, зразумела. Каб побач былі лес, рачулка.

З пераездам у ціхую вёсачку, непадалёку ад якой калісьці затануў дуб, Сініліны ўсё гэта і атрымалі. Дзякуючы нашым законам, якія дазваляюць такую вольнасць, у сэнсе — дзе падабаецца, там і жыві. Што хочаш, садзі і вырошчвай. Акрамя канаплі і маку…

## 2

Уладкаваліся яны, можаце не сумнявацца, добра. Бульбачка, агурочкі, цыбулька… Усё чыстае, усё сваё. Вакол кветкі, пчолкі. Суседка малачко, тваражок дае. Камерцыйная крамка побач… Чаму не жыць, не радавацца?..

Летам да іх пачалі прыязджаць дачка з зяцем. Пазагараць, пахадзіць басанож па лузе, панюхаць кветак, адным словам, набрацца сіл. Каб потым гэтыя сілы павезці ў горад. І там ужо хваліцца, які гэта цуд у нашым бурным, занадта ўжо вірлівым жыцці — вёска!..

Пра тое, што дае сучаснаму чалавеку адпачынак у патаемнай і прыцягальнай глухамані, тлумачыць нікому сёння не трэба. Звычайна гараджане прыязджаюць у вёску затурканыя сваімі шматлікімі пра-

блемамі, бледныя, худыя. А пры развітанні — калі яны там пару тыдняў правялі — усе ім зайздросцяць: кроў з малаком! У цудоўным настроі садзяцца ў свае шыкоўныя «тачкі». Жартуюць, усміхаюцца. Гатовы зноў да гарадскога жыцця.

Але не пра сырадой, цыбулю і кветкі далей гаворка пойдзе. У зяця Сініліных душа трымцела прадпрымальніцтвам, дакладней кажучы — дробнаўласніцтвам. Такі вывад суседзі зрабілі хутка. Пасля таго, як Ірына Карпаўна мела неасцярожнасць паведаміць: «Зяцёк наш, Сцяпанка, сваю справу распачаў. Прадпрымальніцтвам заняўся…»

Доўгіх размоў на гэту тэму не было. Не той зараз час, каб асуджаць, наадварот, трубяць: бізнесу — дарогу! Распачынайце, хто супраць… Каб толькі добра кончылі. Ды нас не ўплялі ў якую-небудзь гісторыю.

Што датычыць зяця Сініліных, то нехта бяскрыўдна дадаў: «Наўрад ці будзе яму зараз па душы і ў радасць бавіць час у нашых мясцінах. Таму, хто распачынае сваю справу, да лямпачкі грыбы ў лесе і кветкі на лузе. Не зацікавяць бізнесмена драбяза-рыба і нават вялікія ракі».

Але тут распачыналася ўсё не па іншым сцэнарыі.

Сцяпан крочыць па беразе знаёмай нам рачулкі. Ён узброены па апошнім слове навукі і тэхнікі: у руках мудрагелістыя складныя вуды — гэта для прыкрыцця, а розныя сеткі-невады — для справы. І поліэтыленаванае вядро літраў на дваццаць. На бліскучай міні-цялежцы. Пры джынсах, заморскіх, зразумела. З заклёпкамі. І тыграм-малюнкам на спіне. А спераду — баксёр. Маўляў, ведайце мяне. А хто не ведае, чытайце: «Майк Тайсан». І ў дадатак да ўсяго — на галаве стракатая кепка.

Зяць Сініліных трымае курс да вады. Раптам ён спыняецца, кідае ўбок снасці, вядро, здымае зялёныя акуляры і накіроўвае свой дробнаўласніцкі позірк да ракі. І што ён бачыць? Сцяпан бачыць там

вялізную карчажыну, пры дэталёвым аглядзе якой прыходзіць да высновы: у двух метрах ад берага ляжыць на дне дуб. І дакладна вызначае — ляжыць гэты дуб у вадзе гадоў пяцьдзясят, а можа, і ўсе сто. У мужчыны адразу з'яўляецца жаданне скокнуць у раку і выцягнуць знаходку. Бо ён ведае: мочаных дубоў з такім тэрмінам ды яшчэ такіх памераў у іх горадзе днём з агнём не знойдзеш. Ва ўсякім разе, іх дрэваапрацоўчы камбінат па вытворчасці цяжкай мэблі і аддзелцы шчыпковых музінструментаў, дзе працуе Сцяпан, мае вострую патрэбу ў каштоўных пародах дрэў, і ў першую чаргу — у мораным дубе. А тут — бяры не хачу! Ляжыць у вадзе без аховы, нікому не патрэбны. Гэта ж скарб. Кландайк!

Сцяпан плыве ў думках далей. Ён уяўляе: колькі звышдэфіцытнай мэблі можна вырабіць знаёмым і незнаёмым заказчыкам, якую колькасць пусціць на музінструменты. Па яго меркаванні, музычная справа і культура ідуць у тым напрамку, што вось-вось будуць запатрабаваны дубовыя цымбалы, звыштрывалыя скрыпкі і розныя балалайкі. Можна сур'ёзна падумаць тады і пра экспарт… І замест ламачыны — цесцевага «Жыгуля» — ён выразна бачыць у сваім гаражы даўнюю сваю мару — «форд».

Але ж заканчваецца яго адпачынак, на заўтрашні дзень запланаваны ад'езд. Таму Сцяпан, кінуўшы на беразе ўсе рыбацкія прычындалы, панёсся ў вёску. Выйсце было там, у хаце цесця.

3

— Тут трэба адну справу вертануць, тата! — усхвалявана пачаў ён тлумачыць Піліпу Лук'янавічу. — Тысяч на дзесяць, а мо і на ўсе дваццаць…

Цесць са здзіўленнем паглядзеў на зяця:

— У нас жа зараз разлікі ў большых лічбах. Мільянерамі мы ўсе сталі…



## НАЙДЗІН Васіль Іванавіч

(псеўданім Васіль Чаромхін)

Нарадзіўся 19 студзеня 1944 г. у в. Бярозаўка Бялыніцкага раёна Магілёўскай вобласці. Празаік, сатырык, гумарыст.

Бацька, Найдзін Іван Андрэевіч, падчас Вялікай Айчыннай вайны быў партызанам. Маці, Пласконная Анэля Францаўна, працавала бухгалтарам. З 1948 года выхаваннем Васіля Іванавіча займаўся айчым — Зімавілін Рыгор Ігнатавіч.

У 1953 г. сям'я пераехала на жыхарства ў г. п. Бялынічы, дзе Васіль Найдзін закончыў сярэднюю школу. Скончыўшы Мінскую школу кінамеханікаў, працаваў у Бялыніцкім раёне. Вайсковую службу праходзіў у часцях Чарнаморскага і Балтыйскага флатоў (1963–1967).

З 1967 года працаваў фотакарэспандэнтам, літработнікам, загадчыкам аддзела пісьмаў, намеснікам рэдактара ў бялыніцкай раённай газеце «Зара камунізма». Завочна скончыў Магілёўскі

педагагічны інстытут (1973). У 1977 годзе скончыў Мінскую вышэйшую партыйную школу (дзённае аддзяленне, група рэдакцыйна-выдавецкіх работнікаў), працаваў рэдактарам аддзела пісьмаў, рэдактарам аддзела фельетонаў у часопісе «Вожык», намеснікам рэдактара газеты «Мінская праўда». З 1991 года — намеснік загадчыка, з 1993-га — загадчык рэдакцыйна-выдавецкага аддзела Сакратарыята Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. З 1997 года — начальнік Рэдакцыйнага ўпраўлення Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Член Саюза пісьменнікаў Беларусі з 1994 г.

Літаратурную працу пачаў у 1965 годзе. Першае гумарыстычнае апавяданне з'явілася на старонках газеты «На страже Балтики». Гумарэскі, сатырычныя творы, апавяданні, навелы, эсэ ў розны час друкаваліся на старонках штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва», у газетах «Звязда», «Чырвоная змена», «Знамя юности», часопісах «Беларусь», «Работніца і сялянка», «Вожык», «Родная прырода». Некаторыя творы выконваюцца артыстамі размоўнага жанру, гучаць па радыё ў перадачы «На вясёлай хвалі».

Аўтар кніг «Мужчынскія сакрэты» (1981), «Аддаю вам» (1984), «Сустрэнемся ў Барселоне» (1991), «Кветка кактуса» (1992). Апавяданні, фельетоны Васіля Найдзіна змешчаны ў калектыўных зборніках сатыры і гумару «Сакрэт фірмы», «Кубік Рубіка», «Ад гарэлкі розум мелкі» і інш.

Асобныя творы перакладзены на рускую, украінскую, літоўскую, туркменскую і польскую мовы.

# Змест

Далёкае — зблізку. *Іван Кананові* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

МОРАНЫ ДУБ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7
ЗЯЛЁНЫЯ ПАМІДОРЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 19
АНЮЦІНЫ ВОЧКІ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 41
«ЯГАДА-МАЛІНА» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 59
АНЕКДОТ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 74
ПІСЬМО З ВОСТРАВА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 80
КАЛІ СМЯЮЦЦА ДРЭВЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . 84
МАЛІНАЎКІ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 90
ДЗВЕРЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 100
КЛАВА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 106
САЛАЎІ ВЫРУЧЫЛІ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 110
МІЛЬЁН РУЖ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 118
ЦІ ДОБРА БЫЦЬ ПТУШКАЙ? . . . . . . . . . . . . . 122
СМАК СЛАВЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 125
КРЫТЫКА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 129
НЕ БЯРЫЦЕ ДА ГАЛАВЫ... . . . . . . . . . . . . . . 133
ТРЫНАЦЦАТЫ ІГРОК . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 137
ПАЗНАЁМІЛІСЯ
(*Паводле сучасных тэлесерыялаў*) . . . . . . . . . . . . . 142
АЎТАРЫТЭТНЫ ГУМАР . . . . . . . . . . . . . . . . . 148
УСМЕШКА ШЭФА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 152
ПОЎНАЯ ГАРМОНІЯ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 164
Я — БАЛЕЛЬШЧЫК . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 168
ЖЫВІ ДЫ РАДУЙСЯ! . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 173

СУСТРЭНЕМСЯ НА СТАДЫЁНЕ . . . . . . . . . . . . . . . 180
АФІЦЫЙНЫ СІГНАЛ (*Пісьмо ў рэдакцыю*) . . . . . . . 183
ДАПАМОЖАМ ТАЛЕНТАМ! . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 187
ТАКУЮ ЖОНКУ ПАШУКАЦЬ… . . . . . . . . . . . . . . . 196
ЛЕСВІЦА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 199
ТРЫ ПІСЬМЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 206
НА ДОШЦЫ ПАД ВЕТРАЗЕМ . . . . . . . . . . . . . . . . 211
НОЎТБУК . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 216
НЕ ХАЧУ Ў ГІМАЛАІ! (*Пісьмо ў рэдакцыю*) . . . . . . . 221
«ДАЮ ЎСТАНОВАЧКУ...» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 223
ЛІМОНЧЫК ДА ШАМПАНСКАГА
(*Да пытання аб сціпласці*) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 228
ДЗЯКУЙ ЗА КРЫТЫКУ!.. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 231
КРОС . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 234
ВЫШЫНЯ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 236
НОВАЯ ТЭХНІКА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 240
ПАДАРУНАК ДЛЯ ЖОНКІ . . . . . . . . . . . . . . . . . . 242
ВЫРАТАВАЛЬНАЯ НІЧЫЯ . . . . . . . . . . . . . . . . . . 246
ХЛОПЕЦ З АФРЫКІ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 250
НУЛЬ З МІНУСАМ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 251
ПАДЗЯКА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 255
ГРЫБЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 258
ДЗЕ ВЫ, АДВАКАТЫ?.. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 260
ЦЯЖКІ ДЗЕНЬ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 262
ПАЦАЛУНАК . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 264
ДВА БАКІ АДНОЙ СПРАВЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . 266
ВУЧЭННЕ — СВЯТЛО . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 267
НЯХАЙ ЁН І ПРАЦУЕ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 269

ЯК МЯНЕ ВІНШАВАЛІ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 270
КОЦІКІ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 271
СУСТРЭЧА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 272
ІНТЭРВ’Ю . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 275
АПОШНІЯ ПРЫГАТАВАННІ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 277
ДАЙЦЕ ПАРАДУ! (*Ліст у рэдакцыю*) . . . . . . . . . . . . . 278
УСЁ ПРАВІЛЬНА!.. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 279
ЖОРСТКАСЦЬ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 281
ЦЮЛЬПАНЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 282
**Пра аўтара** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 283